*УДК 821.161.3’06-311.6*

**А. В. Канаваленка**
***Навук. кір. – В. К. Шынкарэнка, д-р філал. навук, дацэнт***

# МУДРЫЯ ЎРОКІ МІНУЎШЧЫНЫ

Артыкул прысвечаны разгляду творчасці Л. Дайнекі, а ў прыватнасці – гістарычнага раманнага цыкла пісьменніка. Як і ўся айчынная мастацкая гістарыяграфія, проза пра мінулае гэтага аўтара, нягледзячы на ўвагу да яе шматлікіх даследчыкаў, у многіх аспектах патрабуе больш глыбокага і шматузроўневага літаратуразнаўчага асэнсавання. Уяўляецца актуальным далейшае сістэмна-комплекснае вывучэнне гістарычных раманаў Л. Дайнекі, засяроджанасць на асаблівасцях іх зместу і формы, вобразнай сістэмы і стылю і некаторых іншых адзнаках паэтыкі, што дазволіць стварыць больш цэласнае ўражанне пра непаўторнасць творчай індывідуальнасці мастака наогул.

Інтарэс да даўніны спакон вякоў караніцца ў сутнасці чалавека. У нейкі момант, зразумела, не без уплыву шматлікіх фактараў, цікавасць да мінулага, прага даведацца пра тое, што было і чаго ўжо няма, становяцца асабліва нястрымнымі. Якраз у працэсе пошукаў сваіх каранёў, гісторыі краю мы пераконваемся, што мінулае не заўсёды жадае раскрывацца цалкам, ва ўсім багацці фактаў, прыкмет, дэталей; у некаторых выпадках яны ўвогуле адсутнічаюць; часта бывае надзвычай складана размежаваць у асобных і толькі на першы погляд цэласных храналагічных перыядах напластаванні ранейшага і пазнейшага, але такія цяжкасці не павінны засмучаць ці спыняць акрыленую прагай пазнання асобу. Па перакананні Л. Дайнекі, чалавеку, які не ведае гісторыі, вельмі цяжка плысці па яе рацэ: «Асабліва цяжка дабрацца да вытокаў, да тых мясцін, дзе ракі, па сутнасці, няма, а ёсць тоненькія ручайкі, вадзяныя ніткі, з якіх праз колькі дзесяткаў кіламетраў спляцецца, сатчэцца шырокі абрус» [1, с. 5].

Лепшыя творы гістарычнай тэматыкі скіраваны на засваенне сучаснікамі неацэннага эмпірычнага і духоўнага вопыту продкаў, адраджэнне мінулага з тым, каб вярнуць народу і кожнаму з нас пачуццё нацыянальнай годнасці, павагі да сябе, гонару за сваю зямлю і яе слаўтых сыноў. Прытым, што ўвагу пісьменнікаў прыцягваюць усе без выключэння папярэднія перыяды жыцця, пачынаючы ад міфічных часоў і заканчваючы нашымі днямі, у пераважнай колькасці твораў гістарычнай тэматыкі, як лічыць К. Тарасаў, яшчэ адзін яркі прадстаўнік

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

яе, даследуецца барацьба «за шчасце, якую вялі папярэднія пака-ленні», асэнсоўваюцца «пазнаныя імі тупікі бездухоўнасці і духоўныя ўзвышэнні» [2, с. 204]. Акрамя таго, гістарычная проза, па словах гэтага надзвычай патрабавальнага да сябе і іншых пісьменнікаў аўтара,

«адрозніваецца ад прозы “сучаснай” істотнаю, можна сказаць, “прывілеяй” – наш чытач амаль нічога не ведае з роднае даўніны, таму ўсё ідзе яму за першы гатунак, і толькі спецыялісты ды начытаныя аматары гісторыі здольныя выявіць, наколькі праца пісьменніка адпавядае фактам эпохі і праўдзе крыніц. “Люду паспалітаму” прыхо- дзіцца шчыра прымаць на веру аўтарскую дасведчанасць (часам недасведчанасць за дасведчанасць) і ўводзіць рэканструкцыю пэўнай мінуўшчыны ў сваю карціну свету, у сваю гістарычную свядомасць» [2, с. 195].

Якраз быць дасведчаным, праўдзівым, шчырым ва ўсім заўжды імкнуўся (і, на шчасце, працягвае гэта рабіць) Л. Дайнека. Варта ўдакладніць, што пісьменнік яшчэ ў паэзіі выявіў непадробную цікавасць да тэмы мінулага і непарыўнай повязі сівых вякоў з сучаснас- цю, якая атрымала заканамерны працяг і далейшае ўвасабленне ў буй- ных эпічных формах. Пачаткам плённай працы ў дадзеным накірунку трэба лічыць першую палову 70-х гг., бо менавіта ў гэты час творчая спадчына пісьменніка пачала папаўняцца новымі празаічнымі творамі («Людзі і маланкі» (1798), «Запомнім сябе маладымі» (1981)), скіраванымі на асвятленне надзённых сацыяльна-палітычных і духоўна-маральных праблем ў пераломны момант станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Мастак застаецца верным абранаму некалі кірунку і далей: «цікавасць да айчыннай гісторыі праходзіць праз усю творчасць пісьменніка» [3, с. 158].

Самымі вядомымі творамі Л. Дайнекі з’яўляюцца яго арыгіналь- ныя па змесце і сюжэтна-кампазіцыйным вырашэнні раманы «Меч князя Вячкі» (1987), «След ваўкалака» (1988) і «Жалезныя жалуды» (1990), што разам утвараюць своеасаблівы гістарычны раманны цыкл. Цікава, што часапрастора буйных эпічных твораў аўтара звязана не толькі з лёсамі і дзейнасцю выключна гістарычных асоб (князі Вячка, Уладзіслаў, Уладзімір; кунігас Міндоўг), але і са зваротам да не менш яркіх, жыццёва пераканальных выдуманых герояў (Якаў, вяшчун Ва- ласач, Мірошка), якія «інтуітыўна тонка, глыбока ўспрымаюць свет, з’явы прыроды, яе хараство, веру; імкнуцца спасцігнуць іх складанас- ці» [4, с. 66] і тым самым дапамагаюць пісьменніку вытлумачыць, больш дакладна асвятліць і перадаць жывое дыханне тагачаснага свету.

Думаецца, што поспех у цэлым традыцыйнай гістарычнай прозы Л. Дайнекі (за выключэннем хіба толькі раманаў «Назаві сына

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Канстанцінам» і «Чалавек з брыльянтавым сэрцам») можна вытлумачыць нетыповасцю творчага мыслення мастака слова, яго арыгінальным філасофскім бачаннем даўніны, сінтэзам рэалістычнага і рамантычнага пачаткаў, арганічным спалучэннем дакументальнасці з домыслам і фантазіяй, плённым выкарыстаннем фальклорных элементаў, а таксама сюжэтнай дынамікай і псіхалагізмам твораў. Менавіта дзякуючы ўдумліваму падыходу аўтара да канкрэтнага матэрыялу, таленавітага мастацкага ўвасаблення ім задуманага гістарычныя з'явы ў яго раманах пачынаюць ўспрымацца не як прывідна-архаічныя, а як жывыя, поўныя драматызму і выпрабаванняў, старонкі айчыннай гісторыі, многія з якіх ацалелі толькі дзякуючы народнай памяці. Сам пісьменнік не сумняваецца: «Без легендаў гісторыя губляе сваю прывабнасць, таямнічасць. Гэта – як неба без зорак» [5, с. 6].

Трэба сказаць, што сінтэз розных жанрава-стылявых пачаткаў значна ўзбагачае змест і структуру гістарычных твораў пісьменніка, дапамагае яму ўзнавіць многія старонкі даўніны ці запоўніць яе існуючыя фактычныя прагалы, растлумачыць асобныя трагічныя моманты з тым, каб адрадзіць у душах беларусаў пачуццё нацыянальнай свядомасці і годнасці за самабытнае і гераічнае мінулае, выявіць горкія наступствы бяспамяцтва для сучаснікаў і нашчадкаў.

Якраз з гэтай мэтай і браўся Л. Дайнека за стварэнне сваіх раманаў. «Чаму мы ў большасці сваёй не ведаем імёнаў уласных прадзедаў? Вы скажаце, што мы не шляхцюкі, не дваране, што рабочыя або сяляне з-за сваёй сацыяльнай забітасці і прыніжанасці не мелі магчымасці цікавіцца сваім радаслоўным генеалагічным дрэвам. Што ж, у гэтым ёсць рацыя. Але кітайскія і в'етнамскія сяляне, калі іх спытаць, упэўнена назавуць імя любога свайго продка, які жыў тысячу гадоў назад. Значыць, трэба вучыцца гістарычнай памяці. Іншага шляху няма, калі мы хочам застацца народам» [6, с. 5].

Творчасць Л. Дайнекі арганічна ўваходзіць у агульны кантэкст сучаснай айчыннай і сусветнай гістарычнай прозы. Аўтар істотна пашырае дыяпазон мастацкага асэнсавання мінулага, паэтызуючы пры гэтым не толькі подзвігі продкаў, культуру старажытнай Беларусі, асаблівасці яе вераванняў і іншых традыцый, але і ствараючы аб'ектыўную і цэласную карціну заўжды няпростага гістарычнага працэсу. Раманы пісьменніка адрозніваюцца панарамнасцю, шырынёй ахопу матэрыялу; прываблiваюць захапляльнымі, часам неверагоднымі, сюжэтамі і нацыянальным каларытам. Яны напісаны добра стылізаванай, але не перагружанай архаізмамі і гістарызмамі, мовай. Мастацкае мысленне «сувязнога вякоў» абапіраецца на дакладнае веданне рэалій далёкай эпохі, зрокава-адчувальныя падрабязнасці з жыцця

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

продкаў, надзейныя факты, прадстаўленыя з праверaных летапісных і іншых дакументальных крыніц, што ўсё разам пакідае ўражанне поў- най адпаведнасці адлюстраванай аўтарам даўняй эпохі і адначасова дэманструе той выключны аб’ём тытанічнай працы, якую давялося яму прарабіць.

Ці не таму творы Л. Дайнекі здольныя абудзіць у сэрцы кожнага з нас пачуццё адказнасці перад судом гісторыі, якая жорстка помсціць тым, хто не памятае яе, не хоча ўслухоўвацца ў перазовы-напаміны сівых вякоў, каб здолець спасцігнуць і засвоіць іх мудрыя ўрокі?..

## Спіс літаратуры


1 Дайнека, Л. Меч князя Вячкі / Л. Дайнека. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1987. – 597 с.

2 Тарасаў, К. Падзеі гісторыі і версіі літаратуры / К. Тарасаў // Полымя. – 1988. – № 2. – С. 195–204.

3 Шамякіна, М. Леанід Дайнека. Школьны факультатыў / М. Шамякіна // Полымя. – 2007. – № 1. – С. 157–161.

4 Шынкарэнка, В. Нястомных пошукаў дарога. / В. Шынкарэнка. – Мінск: Навука і тэхніка, 2005. – 217 с.

5 Дайнека, Л. Меч князя Вячкі / Л. Дайнека. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1987. – 597 с.

6 Дайнека, Л. Жалезныя жалуды / Л. Дайнека. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1993. – 715 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ